вярнай смерці або дылема - ганьба ці смерць. Як ужо зазначалася ў крытыцы, у канфлікце ўдзельнічаюць тры сілы - трагічная ахвяра, герой-мсцівец, вылюдак-кат. Да таго ж, каб зрабіць карціну пякучай, як абвінавачванне, К. Чорны часам нават у пэўнай меры ігнаруе мастацкасць, і тады апавядальная плынь насычаецца спецыфічнымі прыёмамі і спосабамі публіцыстычнага дыскурсу. Першаступенную ролю тут часта адыгрывае і сам факт, пастаўлены ў цэнтры твора. Пераацэнка ж факта, як вядома, таксама вядзе да звужэння мастацкай праўды. І дзеля таго, каб праўда факта пераўтварылася ў мастацкую праўду, трэба з гэтага факта, кажучы словамі М. Горкага, «здабыць сэнс», пазначыць яго месца ў шэрагу другіх сумежных фактаў, адчуць і вызначыць ходу падзей.

Думаецца, што трагічныя падзеі Вялікай Айчыннай вайны, жаданне бачыць ворага пераможаным, а гвалт і смерць адпомшчанымі, перашкаджалі аддаліць факты ў свядомасці, каб уражанне ад іх выспела.

Аднак тут нельга скідаць з рахунку, што К. Чорны малюе пачатак народнай барацьбы і таму, нягледзячы на эпізадычнасць у яе паказе, апавяданні ўносяць новае ў разумение тагачасных падзей, узрушаюць трагічнасцю намаляваных чалавечых лёсаў. І хоць у ідэйных адносінах гэтыя творы менш вострыя, чым публіцыстычныя, адлюстраваныя ў іх карціны народных бедстваў тояць у сабе вялікі эмацыянальны зарад. Напружаная праца пісьменніка па пераадоленню пэўных недахопаў дала плён: ім былі напісаны такія творы, як «Пошукі будучыні», «Млечны шлях», «Вялікі дзень», «Скіп'ёўскі лес».

Першыя гады Вялікай Айчыннай вайны сталі суровым выпрабаваннем існаснасці і жыццёвасці ідэй К. Чорнага як пісьменніка, яго канцэпцыі часу і асобы, поглядаў на прагрэс і мінулае Бацькаўшчыны. І трэба сказаць, што многія з іх вытрымалі выпрабаванне з гонарам. У гэтым бачыцца вялікая значнасць асобы беларускага празаіка, 105-годдзе з дня нараджэння якога спаўняецца сёлета, а таксама ваенна-патрыятычных твораў, у якіх К. Чорны, па-мастацку асэнсоўваючы падзеі Вялікай Айчыннай вайны, давёў, што беларусы, баронячы свабоду і незалежнасць сваёй Радзімы, адмаўлялі тое, на чым трымалася фашысцкая ідэалогія, палітыка, мараль, адкрываючы гэтым эру паспяховага змагання за мір на Зямлі, за светлы яе заўтрашні дзень.

ЛІТАРАТУРА

Белинский В.Г. О классиках русской литературы. Мн., 1976.
Булацкі Р.В., Сачанка І. І. Чорны - публіцыст. Беларуская публіцыстыка. Mh., 1972.
Современное зарубежное литературоведение. Страны Западной Европы. М., 1999.
Тургенев И. С. 36. тв.: У 12 т. М., 1958. Т. 12.
Тычына М. А. Кузьма Чорны: эвалюцыя мастацкага мыслення. Мн., 2004.
Франс А. 36. тв.: У 8 т. М., 1960. Т. 8.
Чорны К. 36. тв.: У 6 т. Мн., 1955. Т. 6.
Чорны К. 36. тв.: У 6т. Мн., 1990. Т. 5.

Пастуліў у рэдакцыю 07.04.05.

*Людміла Уладзіміраўна Карпава* - старшы выкладчык кафедры беларускай літаратуры і культуры.

*Ю.М. ЛІТВІНАВА*

## АСЭНСАВАННЕ ВАЙНЫ Ў ПАЭТЫЧНАЙ ТВОРЧАСЦІ УЛАДЗІМІРА КАРАТКЕВІЧА

Исследуется тема войны в поэзии В. Короткевича: в военных балладах, поэмах, а также философских стихотворениях, в которых образ войны представлен обобщенно. Показана связь художественных приемов изображения войны с искусством кинематографии.

War theme in V. Korotkevich's poetry is investigated in the article. War ballads and poems are analyzed as well as philosophical poems where the image of war has a generalized character. The bond between artistic methods used by the poet when creating the war image and cinematography art has been shown.

Паэтычныя творы У. Караткевіча на ваенную тэматыку можна ўмоўна падзяліць на дзве групы: 1) вершы, у якіх гераічныя і трагічныя эпізоды Вялікай Айчыннай вайны з'яўляюцца тымі абставінамі, у якіх праяўляецца характар лірыч-

нага героя; 2) вершы, у якіх па-філасофску асэнсоўваецца вайна як агульначалавечая трагедыя.

Першая прадстаўлена баладамі тераічнага характеру («Партызанская балада», «Балада пра смяротнікаў», «Трасцянец», «Разведчык», «Балада пра чалавека, які змагаўся са смерцю»), паэмамі («Бацькава сэрца», «Слова пра чалавечнасць»). І гэта заканамерна, паколькі «пафас балады, - адзначыў В. Вітка, - у героіцы» (Вітка 1977). Героі балад і паэм Караткевіча - звычайная жанчына, якая гіне ад рук фашыстаў, выратоўваючы жыццё каханаму чалавеку; купка смяротнікаў, што ў нямецкім лагеры склалі галовы за жыццё маленькага хлопчыка; ахвяры Трасцянца; невядомы разведчык, доля якога - «аднаму на тысячы йсці!» (Караткевіч 1987, 244); паранены салдат, які, змагаючыся са сваёй смерцю, забівае камісара гестапа; Ян Карповіч, які цаною жыцця маленькага сына выратаваў ад смерці аднавяскоўцаў, хаваючы іх на выспе сярод балот; кнігалюб, выдатны знаўца даўніны роднага краю Рыгор Чаховіч, што памірае, а яго дачка застаецца жыць дзякуючы яго веданню падземных хадоў. Як бачым, героі такіх твораў - асобы канкрэтныя і ў той жа час тыповыя, абагульненыя, лёс якіх - «як бы канцэнтраванае выражэнне лёсу народа»; іх маральная пазіцыя -«"маральны кодэкс" усяго народа» (Чабан 1982, 76).

Як таго патрабуе жанр, у ваенных баладах Караткевіч малюе лірычнага героя ў памежным стане жыцця і смерці альбо ў стане выбару, пры гэтым увага акцэнтуецца на раскрыцці ўнутранай сутнасці чалавека, што праявілася праз маналогі і дыялогі, - прыём, які ўжо быў вядомы, згодна з назіраннямі М. Мішчанчука, па ваенных баладах А. Куляшова. Гэта дапамагала актывізаваць драматычны элемент у ваенных творах Караткевіча (гл. Мішчанчук 1992, 99).

Лірычны герой ваенных балад аўтара - гэта перш за ўсё чалавек высокіх маральных якасцей, патрабавальны да сябе, да выканання свайго грамадзянскага абавязку. У яго сэрцы жыве «не толькі вялікая, спапяляючая нянавісць да ворага, але і светлыя пачуцці - любоў да Радзімы, каханне, пяшчота» (Чабан 1982, 86). Вершы на ваенную тэму, як правіла, прысвечаны тераічна загінуўшым героям, таму ў абмалёўцы іх вобразаў галоўным мастацкім прыёмам для Караткевіча з'яўляецца гіпербала:

І твар яго, чорны і горкі, такі незвычайны быў,
Што афіцэр нямецкі вочы ўніз апусціў... (Караткевіч 1987, 18).

Аднаму - без сотняў дывізій,
Без тысяч сконаў і мук.
Аднаму загінуць, зрабіўшы
Ўсё адзінаю парай рук (Караткевіч 1987, 244).

Што яднае герояў твораў Караткевіча пра вайну? Чалавечнасць. Менавіта аб гэтым ідзе размова ў паэме «Слова пра чалавечнасць». Чалавечнасць - адзіная зброя ў руках людзей супраць зла. Менавіта яе, як заразы, баяцца фашысты ў «Баладзе пра смяротнікаў». Адчуваючы ў мірны час подыхі «халоднай» вайны, Караткевіч усё часцей звяртаецца ў сваёй паэзіі да ідэі мірнага суіснавання, заклікаючы:

О простыя зямлі,
        падайце рукі
Адзін другому з братняю любоўю (Караткевіч 1987, 285).

Браты! Сплятайце рукі! (Караткевіч 1987, 351).

Гуманістычная накіраванасць паэзіі мастака відавочная. Але гуманізм, па вызначэнні пісьменніка, «павінен быць ваяўнічым» (Караткевіч 1987, 134), таму героі яго ваенных твораў, як сапраўдныя хрысціяне, аддаюць сваё жыццё за «другі своя», змагаючыся за свабоду народа і Бацькаўшчыны. Яны і сталі ўвасабленнем чалавечнасці ў згаданай вышэй паэме:

Чалавечнасць у пушчы пайшла старажытная,
Бо не хоча рабства на новай зямлі.
Чалавечнасць падпальвае спелае жыта,
Каб яго забойцы узяць не змаглі.
Чалавечнасць за ворагам пільна сочыць

З-за рачных сітнягоў, з-за ляснога кража
І глядзіць захопнікам проста ў вочы
Кожным днём туманным, кожнаю ноччу
Цёмнай дзіркай нацэленага ружжа... (Караткевіч 1987, 133).

Характэрным для мастакоўскага пяра з'яўляецца той факт, што, гаворачы пра мінулыя падзеі Вялікай Айчыннай вайны, Караткевіч звяртаецца да «гістарычных» параўнанняў і метафар (гл. Чабан 1982, 26-27). Менавіта з іх дапамогай паэт стварае гераічны вобраз ахвяр Трасцянца з аднайменнага верша:

Мы - прах. Толькі сэрцы грымяць, як мячы.
Каб цемра не ўпала на край,
Мя згарэлі паходнямі ў лютай начы...
Па-мя-тай!
Па-мя-тай!
Па-мя-тай!!! (Караткевіч 1987, 139).

Прырода роднага краю ў ваенных творах таксама гераізуецца. Асаблівая ўвага надаецца паэтызацыі вобраза бярозы ў вершах «Слова беларускай бярозы» і «Нашы бярозы». У апошнім персаніфікацыя дрэва спалучыла ў сабе народную традыцыю (бяроза - сімвал жанчыны) з баладна-гістарычным мысленнем пісьменніка. Гераізацыя вобраза дасягаецца мастаком пры дапамозе кантрасту, калі рамантычна-ўзнёсламу апісанню бярозы супрацьпастаўляецца суровае, нешматслоўнае апісанне яе смерці:

Палала бярозка, танюткая, чыстая,
Без стогну,
Як Жанна д'Арк.
У дрэўцы, кволенькім, як мімоза,
Цякла зямлі маёй мужная кроў... (Караткевіч 1987, 231).

Зварот Караткевіча да фальклорнай паэтыкі ў творах пра вайну, якія маюць баладны характар, невыпадковы. Паводле І. Штэйнера, прынцыпы ўвасаблення вайны ў беларускай баладзе маюць моцную сувязь з народнай традыцыяй І са «Словам пра паход Ігаравы» (гл. Штэйнер 1993, 101). Яшчэ Р. Шкраба ў рэцэнзіі на зборнік Караткевіча «Матчына душа» адзначаў, што ў асобных радках яго «Партызанскай балады» выразна ўгадваецца паэтычны лад «Слова» (гл. Шкраба 1959, 30):

Хаты стаяць пустыя, лісіцы спяць у хлявах,
Восы, стракатыя восы гнёзды звілі ў чарапах (Караткевіч 1987, 15).

Адметнасць паэзіі Караткевіча ў тым, што вайна ў ёй успрымаецца першнаперш праз трагічны лёс жанчыны (вершы «Жаданы госць», «Балада пра смяротнікаў», «Безгаловая Венера»), Такі ракурс выбраны мастаком невыпадкова. У яго творчасць трывала ўвайшоў вобраз каханай жанчыны, які найбольш яскрава прадстаўлены ў асобе галоўнай гераіні рамана «Нельга забыць» Ірыны Горавай: у яе пад сэрцам з часоў вайны застаўся асколак бомбы, што пагражае смерцю. Многае ў плане вобразнай структуры, кампазіцыйнай пабудовы ўвабрала ў сябе з гэтага рамана «Балада пра галубіныя пер'і». Варожы асколак стаў увасабленнем вайны, якая працягвае сваё жыццё ўнутры гераіні І не дае ёй магчымасці быць шчаслівай у каханні. «Песня пра асколак» ідэйна працягвае баладу. Выкарыстоўваючы прыём казачнай умоўнасці, аўтар звяртаецца да матыву андэрсэнаўскай «Снежнай каралевы»:

Я хачу.
  І адступіць цень.
І цябе з тваёю мужнай тугой
Сагрэе мая рука,
І асколак ты выплачаш з сэрца свайго,
Як выплакаў казачны Кай (Караткевіч 1987, 363).

Барацьбу кахання і смерці, увасобленых у вобразах жанчыны І вайны, можна лічыць адной з асноўных праблем у творчасці мастака. Іх драматычнае супрацьстаянне з'яўляецца заканамерным у паэтыцы Караткевіча, чыя лірыка мае глыбока гуманістычнае гучанне. Гэта апраўдвае выкарыстанне аўтарам грубых выразаў і ненарматыўнай лексікі, калі гаворка ідзе пра вайну. Блізкі да народнага

светаўспрымання прыём персаніфікацыі дапамог аўтару непасрэдна выявіць свае пачуцці:

О, вайна, акопны смурод баёў,
О, адроддзе пекла і зла,
Нават мёртвай - ты знішчыла шчасце маё,
Нават здохлай - гора дала!
Чорны цень твой на кволых дзяўчынак упаў,
Ўсё забіў, запаскудзіў вакол.
Прыбіць бы, сволач, цябе да слупа
І ў глотку асінавы кол! (Караткевіч 1987, 362).

У «Апошняй песні Дантэ» асноўную функцыю ў стварэнні вобраза вайны адыгрываюць гіпербалічныя сродкі апісання: «злосць звяроў // Узнагарылася бы побач з ёю», «Горш сатаны царыца прорвы той» (Караткевіч 1987, 155, 156). Верш насычаны гіпербалічнымі эпітэтамі з групы «бясконцых», сярод якіх дамінуе «бяздонны». Ён сканцэнтраваў у сабе бязмернасць зла, што нясе вайна, і бязмернасць болю, які церпіць ад яе чалавек. Вобраз вайны-вядзьмаркі ў «Апошняй песні Дантэ» ператвараецца ў вобраз дракона-пачвары. Перададзеная мастаком слова ў сярэдневяковых традыцыях карціна пекла, насычаная вобразнасць, гучанне і структура дантаўскіх тэрцын наблізілі паэтычны лад твора Караткевіча да «Боскай камедыі» якая паслужыла не толькі ўзорам, але і дала магчымасць паэту знайсці патрэбны ракурс для асвятлення тэмы вайны. Яго лірычны герой глядзіць як бы з вышыні, адкуль вобразы і падзеі бачацца ўсебакова, ва ўзаемасувязі з акаляючым светам. Менавіта так «глядзіць» на бясконцыя войны І статуя з верша Караткевіча «Безгаловая Венера». Абраны мастаком ракурс сугучны мастацтву кінематографа і дае вялікія магчымасці для маштабнага ўспрымання падзей, павялічваючы канцэнтрацыю вобразнасці твора.

У паказе вайны аўтар звяртаецца таксама І да народна-песенных традыцый. Яскравым прыкладам з'яўляецца інтэрмедыя з пятага раздзела паэмы «Слова пра чалавечнасць», дзе высокая эмацыянальная напоўненасць у адлюстраванні трагедыі дасягаецца паэтам пры дапамозе матыву сватання.

У канцэпцыі мастака вайна з'яўляецца самым вялікім злом, якім наскрозь прасякнута гісторыя чалавецтва. Другая сусветная вайна ўспрымаецца лірычным героем як апакаліпсіс, як жудасны сімвал XX ст. Так, прынамсі, яна малюецца ў вершы «Мой век». Тут аўтар звяртаецца яшчэ да аднаго з кінематаграфічных прыёмаў - мантажу, сутнасць якога заключаецца ў фрагментарнай пабудове літаратурнага твора:

За дрот валакуцца строем...
З «ведзьмаў» высмоктваюць кроў...
Дзяцей, старых і герояў
Бульдозер зграбае ў роў...
Вулканы Мінска і Кіева...
Трэблінкі - вар'яцкі сон...
Вусны жанчын, у якія
Асвенцімскі рвецца «цыклон».
Забітых халодныя горы...
Котлішчаў вечны спакой... (Караткевіч 1987, 240).

Выкарыстанне пісьменнікам гэтага прыёму можна лічыць заканамерным, паколькі яму «адпавядае бачанне свету, якое адрозніваецца шматпланавасцю і эпічнай шырынёй» (Хализев 2000, 278), што ўвогуле характэрна для паэзіі У. Караткевіча. Мантаж дазваляе парушаць часавыя і прасторавыя рамкі, акцэнтуючы ўвагу чытача на ўнутранай сувязі паміж фактамі і падзеямі. Да таго ж ён сугучны не толькі мастацтву кінематографа, але І мастацтву XX ст. у цэлым, «якое не любіць разжоўваць факты, а падае іх, злучаючы паміж сабой пры дапамозе кантрапункта» (Ерофеев 1986, 11).

Пры такім падыходзе вобраз вайны ў вершах Караткевіча набывае філасофскае асэнсаванне. Гаворка ідзе пра творы, якія ўмоўна можна аднесці да другой групы. Да іх належаць вершы «І сніў Адам...», «Бахайская чарапаха», «Мой век», «Цар-гармата», дзе гістарычны працэс атаясамліваецца аўтарам з

вобразам вечнай вайны, у стане якой пастаянна знаходзіцца чалавецтва. Спасцігаючы мінулае, паэт, як і герой яго верша «Прарок Геронім Босх», з непакоем зазірае ў будучыню. Так, рукапіс рускамоўнага варыянта верша «Бахайская чарапаха» захаваў цікавы запіс, які пралівае святло на гісторыю напісання твора: «Много столетий назад на территории Приморья существовало государство Бохай. Его уничтожили орды захватчиков. От него осталось немного, *в* том числе каменные изваяния черепах. Мне показалось, что они молчаливо кричат против войны. И еще - говорят о будущем» (ЦНБ НАН Беларусі, 34).

Працягам ваеннай тэматыкі ў паэзіі Караткевіча з'яўляюцца вершы, у якіх уздымаецца пытанне аб існаванні зброі («Цар-гармата», «Мінашукальнікі»), без якой вайна немагчыма. Удасканаленне зброі сведчыць пра тое, што сутнасць чалавека на працягу ўсёй гісторыі яго існавання так і не змянілася - ён ваюе і дагэтуль:

Адвечная гучыць над светам песня:
Б'юць дзікуны у гучныя тамтамы,
Калоны скіфы валяць на зямлю...
Лятуць, як смерч,
атручаныя стрэлы...
Куюць мячы і вынаходзяць порах...
Агнямі выбухаюць мінаносцы...
І, - завяршэнне, - устае над морам,
Над залатым каралавым пяском
Сляпучы і тупы атрутна грыб.
Цывілізацыя!
Вянец культуры! (Караткевіч 1987, 284).

Паводле разважанняў Караткевіча ў вершы «Вышэйшыя жывёлы, або "Вянец тварэння"», удасканаленне зброі прама прапарцыянальна маральнай недасканаласці чалавека. Апошняе і з'яўляецца прычынай усіх войнаў. Таму творчасць Караткевіча-паэта скіравана перш за ўсё на пошук сапраўднага чалавека - высокадухоўнага, непрымірымага да зла і здольнага шчыра радавацца жыццю.

Зварот паэта да скандынаўскага эпасу нарадзіў у яго творчасці вобраз бітвы пры Рагнарадзі, свайго роду апакаліптычнай вайны, «у якой загінуць героі, // Ў якой загінуць багі», калі «чалавецтву старому // Прыйдзе паўсюль канец» (Караткевіч 1987, 331, 333). Але ў той жа час гэта бітва стане кропкай адліку новага жыцця, дзе будуць жыць новыя людзі, дзе «лёсам нашчадкаў будуць // Толькі кахання раны» (Караткевіч 1987, 334). У пошуках ідэальнага Караткевіч імкнецца сцвердзіць ідэю мірнага суіснавання чалавецтва на зямлі. Верш «Рагнарадзі» завяршае апошні паэтычны зборнік «Быў. Ёсць. Буду» і з'яўляецца апафеозам міру і каханню як галоўным каштоўнасцям чалавецтва.

Такім чынам, у сваіх паэтычных творах Караткевіч-гуманіст выступав супраць усялякіх праяў вайны. Адначасова вайна, прынамсі Вялікая Айчынная, у творчасці мастака з'яўляецца для яго лірычнага героя выпрабаваннем на мужнасць, гатоўнасць ахвяраваць сваім жыццём, што абумовіла баладнае гучанне вершаў гераічнага характару. Спасцігаючы гісторыю, пісьменнік/ імкнецца да філасофскага асэнсавання вайны як сацыяльнага зла. Ён ахоплівае вопыт мінулых эпох і, зазіраючы ў будучыню, заклікае сённяшняга чалавека да мірнага жыцця.

ЛІТАРАТУРА

Вітка В. Магутны лад балад // ЛіМ. 1977. 25 лістап.
Ерофеев В. Мир баллады // Воздушный корабль. М., 1986.
Караткевіч У. Збор твораў: У 8 т. Т. 1. Вершы, паэмы. Мн., 1987.
Мішчанчук М. Ёсць у паэта свой аблог цалінны: Жанрава-стылявая разнастайнасць сучаснай беларускай лірыкі. Мн., 1992.
Хализев В.Е. Теория литературы. Мн., 2000.
ЦНБ НАН Беларусі. Аддзел рэдкасных кніг і рукапісаў. Ф. № 11. Воп. № 1. Адз. зах. № 7. С. 34.
Чабан Т. Крылы рамантыкі: Рамантычныя тэндэнцыі ў сучаснай беларускай паэзіі. Мн., 1982.
Шкраба Р. Свет паэта // Беларусь. 1959. № 2. С. 30-31.
Штэйнер І.Ф. Варожасць балады вякоў: Беларуская балада і славянскія традыцыі. Мн., 1993.

Пасгупіў у рэдакцыю 21.04.05.

Юл/'я *Міхайлаўна Літвінава* - аспірантка кафедры беларускай літаратуры І культуры. Навуковы кіраўнік - кандыдат філалагічных навук, дацэнт А.Л. Верабей.